**ВУЧЭБНА-НАВУКОВАЯ ЛАБАРАТОРЫЯ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ БДУ**

**ЦЭНТР ЗАХАВАННЯ СПАДЧЫНЫ ВУСНАЙ ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСАЎ**

Шаноўныя калегі!

Шчыра запрашаем на чарговае пасяджэнне

**міжуніверсітэцкага дыскусійна-аналітычнага клуба**

**COGITO**

Тэма дыскусіі

# «Эстэтычная, культурная і сацыяльная небяспека дэфармацыі фальклорнай памяці»

*Мае песні растуць з доўгай і сапраўднай традыцыі, у іх яснае бачанне мінулага; іх корань – у сапраўдным рэальным жыцці. І я адчуваю, што дзякуючы майму вясковаму паходжанню, я – злучнае звяно паміж мінулым і сённяшнім днём*

Шырлі Колінз, сучасная брытанская фолк-спявачка

Праблемнае поле дыскусіі :

- фальклорная памяць як *аснова традыцыйнасці* фальклору, яго рэпрадукцыі на аснове стабільнасці і дынамічнасці;
- фальклорная памяць і *ступень устойлівасці* традыцыі;
- фальклорная памяць і *захаванне цэласнасці* вуснатрадыцыйных твораў;
- фальклорная памяць і *інтэнсіўнасць бытавання* вуснатрадыцыйных твораў;
- варыятыўнасць фальклору як *спалучэнне фальклорнай памяці са зменамі асяродку* існавання традыцыі;
- ступень дакладнасці традыцыі і характар *індывідуальнай памяці* этнафораў (носьбітаў фальклору);
- уплыў *пісьменнасці* і *сістэмы абавязковай адукацыі* на існаванне фальклорнай памяці;
- фальклорная памяць і захаванне *культурнай цэласнасці этнасу*.

22.02.2019
а 16-й гадзіне

кафедра этналогіі і фальклору
2 корпус БДУКМ (Маскоўская 18А-529)